А. І.Самусенка,
дацэнт Беларускай акадэміі музыкі

# ШЛЯХІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ БАЯНІСТАЎ (АКАРДЭАНІСТАЎ) У ВЫШЭЙШАЙ МУЗЫЧНАЙ ШКОЛЕ

У 1983 г. пры Беларускай акадэміі музыкі (тады кансерваторыі) была створана школа-студыя з класамі баяна і акардэона. Семнаццаць гадоў ідзе пошук шляхоў удасканалення педагагічнай практыкі: удакладненне яе задач, зместу, формаў кіраўніцтва і справаздачнасці, крытэрыяў ацэнкі вынікаў.

У сувязі з пераходам краіны да рыначнай эканомікі і шматукладнай школы ўзнікае патрэбнасць у падрыхтоўцы педагога-музыканта, здольнага паспяхова ажыццяўляць прафесійную дзейнасць у новых умовах.

Аналіз педагагічнай рэчаіснасці (вывучэнне запытаў школы, грамадскасці да работы педагога-музыканта і ў сваю чаргу запытаў педагога-музыканта да школы і грамадства) выявіў шэраг супярэчнасцей паміж: 1) суб'ектыўнай арыентацыяй выкладчыкаў спецыяльных дысцыплін на сацыяльна сталую, музычна развітую асобу студэнта — і рэальнай неаднароднасцю сацыяльнага вопыту, пазнавальнага інтарэсу да музыкі, да асобы вучня, неаднароднасцю прафесійных і жыццёвых арыентацый студэнтаў музычных ВНУ; 2) асэнсаваннем на ўзроўні тэорыі прынцыпу сувязі навучання з жыццём — і разрывам у інфармаванасці студэнтаў аб глыбінных пластах музычнай культуры сучаснасці і мінулага сваёй краіны і свету; 3) патрэбнасцю сістэмна-філасофскага асэнсавання выкладчыкам сутнасці чалавека — і традыцыйнай абумоўленасцю спецыяльных дысцыплін, арыентаваных на карціну міру, у якую чалавек не ўключаны.

Зняць выяўленыя супярэчнасці ў значнай ступені здольна педагагічная практыка, якая выконвае некалькі функцый:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— арганічна ўключае вывучэнне ўсіх вучэбных дысцыплін ВНУ ў рашэнне канкрэтных педагагічных задач;

— стымулюе патрэбнасць у асэнсаванні канкрэтных педагагічных фактаў і з'яў з пазіцыі спасцігаемай тэорыі;

— развівае прафесійную накіраванасць мыслення, выхоўвае прафесійныя паводзіны.

Педагагічная праца ўяўляе сабой адзінства педагагічнай дзейнасці, педагагічных зносін і асобасных рыс чалавека (А.К. Маркава). Таму мэты педагагічнай практыкі — паглыбленне цікавасці студэнтаў да прафесіі музыканта-выкладчыка, авалоданне тэхналогіяй педагагічнага працэсу, метадамі і прыёмамі самавыхавання і самаадукацыі, актуалізацыя ўзаема- і самаадзнакавай дзейнасці, уключэнне будучага педагога-музыканта ў калектыўны аналіз прафесійнага станаўлення асобы (сваёй і сакурснікаў).

Педагогі-кансультанты Беларускай акадэміі музыкі абапіраюцца на вылучаныя інварыянты дзейнасных характарыстык педагога (незалежна ад тыпу набываемай падрыхтоўкі і месца будучай працы): здольнасць здзейсніць педагагічнае мэтамеркаванне, уменне аналізаваць педагагічную сітуацыю, адбіраць вучэбны і выхаваўчы матэрыял з улікам рэальных магчымасцей навучэнцаў, аналізаваць свае педагагічныя дзеянні. Якасцю, якая структурыруе педагагічнае майстэрства, з'яўляюцца каштоўнасныя адносіны педагога да асобы і да сябе як крыніцы развіцця іншых.

Педагагічная практыка ў Беларускай акадэміі музыкі доўжыцца 2,5 года. У шостым семестры (III курс) праводзіцца практыка назірання ў Мінскім музычным вучылішчы імя М.І.Глінкі. Наведванне і аналіз урокаў педагогаў-майстроў, пазакласных мерапрыемстваў, азнаямленне з метадычнымі матэрыяламі, семінары па вывучэнні рэпертуару ДМШ і музычнага вучылішча папярэднічаюць пачатку самастойнай практыкі з вучнем у школе-студыі пры Беларускай акадэміі музыкі, якая адбываецца ў сёмым—дзесятым семестрах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Работа педагога-кансультанта са студэнтам пачынаецца з арганізацыі адбору дзяцей у школу-студыю. Вызначаюцца сярэднія школы, адбываецца знаёмства з настаўнікамі музыкі і спеваў, нават з дазволу апошніх студэнты ўключаюцца ў педагагічны працэс. Пасля праслухоўвання дзяцей разам з бацькамі запрашаюць у акадэмію музыкі. Канцэрт студэнтаў, будучых практыкантаў, з'яўляецца самым моцным аргументам на карысць заняткаў у класе баяна або акардэона. Праграму выступлення складаюць будучыя настаўнікі, а затым абмяркоўваюць яе з педагогам-кансультантам. Абапіраючыся на веды па педагогіцы і ўзроставай псіхалогіі, рыхтуюцца кароткія вусныя каментарыі да кожнага музычнага твора.

Разам з традыцыйнымі (узорны ўрок выкладчыка-кансультанта, праслухоўванне вучня, разнастайныя кансультацыі, правядзенне студэнтам-практыкантам адкрытага тэматычнага ўрока) апрабіруюцца і іншыя формы работы.

Самастойнае стварэнне і выкананне ансамбляў "студэнт-практыкант — вучань" забяспечвае вырашэнне шэрага задач:

— папаўненне даволі сціплага ансамблевага рэпертуару для баяна/акардэона;

— дапамогу ў выхаванні любові да музіцыравання (вядома, ігра ў ансамблі зніжае пачуццё няўпэўненасці і нават страху перад сцэнай);

— актуалізуе веды і ўменні, набытыя ў курсе "Стварэнне апрацовак мелодый", якія ў акадэміі выкладаюць вядомыя беларускія кампазітары;

— дазваляе "прыдзірліва" дабівацца якасці гучання і фарміраваць яго крытэрыі ў вучня.

Станоўчыя вынікі дало ўвядзенне гульнявых формаў навучання. З аднаго боку, гэта творчасць у музычным выканальніцтве, спроба стварэння ансамбляў-гульняў са слухачамі (ініцыятарам напрацовак разам са сваімі студэнтамі стаў дацэнт К.М. Булыга). З другога — правядзенне конкурсаў самастойна створаных ансамбляў "студэнт-практы-

кант — вучань". Удзельнікам конкурсу загадзя прапаноўваецца адна і тая ж тэма для апрацоўкі. Журы вылучаецца метадам экспертных ацэнак з ліку лепшых студэнтаў іншых спецыяльнасцей: фартэпіяна, скрыпкі, струнных народных інструментаў. Упершыню гэтая форма работы апрабіравана на базе Мінскага музычнага вучылішча аўтарам разам з загадчыкам аддзялення "баян — акардэон" У.Л.Гурба-Новікам у 1995г.

Найбольш значныя вынікі звязаны з конкурсам "лепшы настаўнік курса" (умовы распрацаваны сумесна з дацэнтам К.М.Булыгам і ст. выкладчыкам В.А.Івашка), які ўключае:

— аналіз музычнага твора;

— правядзенне адкрытага ўрока па вызначанай схеме: прадстаўленне (абарона) характарыстыкі вучня, аналіз ходу ўрока (вылучэнне мэты, накіраванасць прыёмаў навучання на яе дасягненне, суаднесенасць рэпертуару мэтам развіцця вучня, характар зносін з вучнем, асаблівасці і якасць музычнага паказу на інструменце, абагульненне спосабаў дзеяння вучня, рысы творчасці вучня, дакладнасць хатняга задання і прынятце яго вучнем);

— выкананне ансамбля ў складзе студэнт-практыкант — вучань;

— падвядзенне вынікаў урока студэнтам-практыкантам;

— абмеркаванне ўрока сакурснікамі.

Названыя арганізацыйныя формы і метады выхавання будучага педагога-музыканта ствараюць умовы самаразвіцця, фарміравання прафесійнай культуры студэнта, яго самавызначэння, а таксама індывідуальна-асобаснага падыходу.

Падсумоўваючы, адзначым: шляхамі ўдасканалення педагагічнай практыкі ў вышэйшай музычнай школе можна назваць:

— распрацоўку праграм прафесійнага самаўдасканалення;

— уключэнне гульнявых формаў навучання;

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

— вывучэнне моцных бакоў асобы маладога выкладчыка-музыканта з мэтай стымулявання патрэбы ў самаўдасканаленні;

— фарміраванне каштоўнасных адносін да асобы вучня, у дачыненні да якой метадычныя веды і выканальніцкае майстэрства з'яўляюцца сродкам яе ўсебаковага развіцця.

**А.І.Смолік,**
**прафесар Беларускага універсітэта культуры**

## СУЧАСНАЕ АСЭНСАВАННЕ МЭТ, ЗАДАЧ І ЗМЕСТУ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўнае будаўніцтва, якое распачалося на мяжы стагоддзяў, немагчымае без карэннай рэарганізацыі сістэмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў народнай гаспадаркі, адукацыі і культуры. Іх кваліфікацыя, кампетэнтнасць і высокая грамадзянская адказнасць у многім забяспечваюць вырашэнне задач, якія стаяць перад грамадствам.

Спецыфічнай формай навучальнага працэсу з'яўляецца вытворчая практыка, якая забяспечвае студэнтам магчымасць атрымання прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў непасрэдна ў мастацка-творчым або педагагічным калектывах, ва ўстановах культуры і мастацтва. Дасягненне мэты навучання немагчымае без пэўнай практычнай падрыхтоўкі будучых менеджэра, бібліятэкара, сацыяльнага педагога, рэжысёра, хормайстра. Таму галоўная мэта вытворчай практыкі — замацаванне тэарэтычных ведаў студэнтаў у працэсе засваення імі сацыякультурнай і мастацка-творчай дзейнасці. Між тым, як сведчыць вопыт, на практыцы нярэдка мэты падмяняюцца задачамі і зводзяцца да фарміравання ў студэнта цікавасці да прафесіі, набыцця ім якасцей, неабходных работніку сацыяльна-культурнай сферы, выпрацоўкі прафесійных уменняў і навыкаў і інш.